# ДУХОЎНАЯ ЕДНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ



**Котаў Віктар Пятровіч,**
*дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі "Глыбачанская дзіцячы сад-сярэдняя школа імя Б.І. Юркіна Ушацкага раёна Віцебскай вобласці"*

*Падзелены век чалавечы*
*з маленства на часткі:*
*да школы,*
*у школе,*
*пасля…*
Е. Лось. "Школы…"

*У артыкуле коратка апавядаецца пра гісторыю Глыбачанскай СШ імя Б.І. Юркіна Ушацкага раёна, пра яе дырэктараў, настаўнікаў і вучняў, пра арганізацыю адукацыйнага працэсу сёння, творчасць настаўнікаў і навучэнцаў.*

Падзеі, што адбываюцца зараз у свеце, сведчаць пра тое, што людская супольнасць можа стаць нетрывалай. Усё часцей гаворым пра непаразуменні паміж народамі, унутры сям'і… Духоўная спадчына яднае людзей, загартоўвае, робіць асобу дзейснай, стваральнай. У вёсках усё часцей толькі школы з'яўляюцца цэнтрам культурнай дзейнасці, аб'ядноўваюць людзей. Школе цяпер яшчэ ў большай ступені трэба адводзіць ролю, якая дапамагае весці пакаленне за пакаленнем да духоўнасці.

Пазнаём сваё роднае – пазнаём свет. Гэта вядома са школы. Родны дом, зямля робяць жыццё светлым і ўтульным. Наш шлях на зямлі пачынаецца з роднага. Школа – гэта адна са ступенек. Таму святкаванне юбілею нашай школы – гэта не толькі зварот у гісторыю жыцця нашых папярэднікаў, але і зварот да разумення імі духоўнага, маральнага ў жыцці. А гэта вельмі патрэбна сучаснаму маладому пакаленню.

У жыцці кожнага ёсць падзеі, якія назаўсёды застаюцца ў памяці. Спадзяюся, што такой падзеяй стала і святкаванне 90-гадовага юбілею Глыбачанскай СШ імя Б.І. Юркіна Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Асаблівым было гэта свята для тых настаўнікаў і вучняў, якія засталіся вернымі сваёй школе.

90 год школе… Гэта змена некалькіх пакаленняў настаўнікаў і вучняў, тысячы лёсаў і розных шляхоў. Магчыма, школе і больш год, бо старэйшыя жыхары вёскі ўспамінаюць, што школа была ў Глыбачцы яшчэ да рэвалюцыі і называлася Сельская. Вучылі ў ёй толькі дзетак першага года навучання. 90-годдзе падмацоўваецца архіўным дакументам, у якім сцвярджаецца, што на 1 лістапада 1923 года ў Віцебскім Губана Полацкага ўезда лічыцца Глыбачанская трохгадовая школа. З гэтай даты мы і вядзём летапіс нашай школы, бо, як сказаў М. Гусоўскі, "Кожны народ не без роду і племя і мае летапіс свой і гісторыі след на старонках".

Шмат падзей адбылося за гэты час… У 30-я гады школа размяшчалася ў хаце кулака Радзішэўскага. Працаваў у ёй адзін настаўнік. У гады Вялікай Айчыннай вайны многія настаўнікі і вучні школы сталі членамі першага на Ушаччыне партызанскага атрада "Смерць фашызму": А.Ц. Гайдук (дырэктар), І.А. Кіслоў, П.М. Карпоўскі, Ф.Ф. Лашкевіч (настаўнікі), Юлія і Валянціна Бераснёвы, Уладзімір і Тамара Стануль, Генадзій Талочка, Анатолій Красінскі і іншыя вучні. Розным быў іх шлях па дарогах вайны. На тэрыторыі школы яшчэ ў 1966 г. у гонар усіх загінуўшых быў адкрыты абеліск, пабудаваны

Репозиторий ВГУ

рукамі настаўнікаў і вучняў. У школьным музеі экспазіцыя "Яны змагаліся за Радзіму" расказвае пра былых вучняў і настаўнікаў у гады ВАВ.

Пасля вайны школа стала сямігадовай (загад Ушацкага РАНА ад 05.09.1944 г. № 17). На свяце прысутнічала першая выпускніца сямігодкі Т.Р. Уліцкая (Волкава), якая падзялілася ўспамінамі пра настаўнікаў і аднакласнікаў. Шмат цёплых слоў ёю было сказана ў адрас завуча і настаўніка сямігодкі Ф.Ф. Лашкевіча, настаўніц першых пасляваенных дзесяцігоддзяў К.І. Іванковіч, М.Б. Дубко, М.П. Іванковіч.

Шмат сіл і энергіі аддаў школе І.В. Законнікаў, які ўзначальваў яе з 1954 па 1960 год. У гэты час школа была пераўтворана ў сярэднюю. І дырэктару разам з настаўнікамі трэба было ўзводзіць новыя будынкі для школы. Пад яго кіраўніцтвам у гэты час вялася работа па збору матэрыялу пра Героя Савецкага Саюза Б.І. Юркіна, у выніку чаго ў 1966 г. школе прысвоена імя Б.І. Юркіна.

Далей школьны карабель па жыцці павяла Н.Т. Сарадуб (Бобчанка) (1960–1963 гг.). Гэта быў перыяд распрацовак метадычных, арганізацыйных і заканадаўчых пытанняў па пераводзе работы школы па праграме з вытворчым навучаннем, стварэнне адпаведнай вытворчай базы. За перыяд летніх канікулаў вучні вырошчвалі больш за тысячу качак і каля ста трусоў для саўгаса "Глыбачаны". Зараз ветэран працы, выдатнік адукцыі СССР і Беларусі Н.Т. Бобчанка жыве ў г. Верхнядзвінску.

Наступнага кіраўніка школы, М.К. Каплеўскага (1968–1973 гг.), вылучалі цярпенне і добразычлівыя адносіны да кожнага падначаленага. На прышкольным участку былі адкрыты пітомнік, дэндрарый, парнікі, папаўнялася абсталяваннем школьная майстэрня, адкрылі новую сталоўку і інш. Настаўнікі і вучні школы стварылі тэатральны гурток, ставілі спектаклі ў клубе і навакольных вёсках, а ў чэрвені 1971 года іх спектакль "Дзівосы на калёсах" здымала тэлебачанне. У гэты час узводзіўся і новы будынак школы. А вось праца па добраўпарадкаванні школьнай тэрыторыі, разбіцце новага прышкольнага ўчастка лягла на плечы В.У. Талочкі, якая з'ўлялася дырэктарам з 1973 па 1978 год.

Дырэктарамі школы ў розныя часы былі Л.І. Ліскова, І.С. Жарнасек, Н.П. Фёдарава, М.Ф. Папельская, якія шмат увагі ўдзялялі навучальнаму працэсу, павышэнню якасці адукацыі, афармленню кабінетаў школы, працы вучнёўскай вытворчай брыгады, турыстычнай працы…

Пад кіраўніцтвам Г.Л. Кляпец, з 1997 па 2009 год, школа займала першае месца ў раёне. Галіна Леанідаўна – дэлегат ІІ Усебеларускага народнага сходу, удзельніца абласнога конкурсу "Настаўнік года". Падчас яе працы школа актыўна працавала над праблемамі аптымізацыі навучальнай дзейнасці і навуковай арганізацыі працы, актыўна вывучаўся наватарскі вопыт.

Школа ганарыцца сваімі выпускнікамі-медалістамі Наталляй Хвошч (сярэбраны медаль, 1991 г.), Аленай Волкавай (залаты медаль, 1994 г.), Юліяй Кляпец (залаты медаль, 1995 г.).

На змену старэйшаму пакаленню прыйшла моладзь. С.В. Зайцава (выпускніца нашай школы) працавала дырэктарам з 2009 па 2012 год. Адбыліся некаторыя перамены, у тым ліку змянілася назва школы. Яна стала школай-садам. Прыбавілася яшчэ больш клопатаў. Нягледзячы на цяжкасці, Святлана Васільеўна захапіла творчай працай і настаўнікаў, і вучняў.

Паслядоўная праца педагагічнага калектыву над пастаўленымі задачамі дазволіла дасягнуць пазітыўных вынікаў у арганізацыі адукацыйнага працэсу. Зараз у школе працуе 19 педагогаў, якія шукаюць эфектыўныя прыёмы і формы работы з вучнямі.

Важным накірункам работы школы з'яўляецца пастаяннае ўдасканаленне педагагічнага майстэрства настаўніцкіх кадраў праз курсавую сістэму павышэння кваліфікацыі пры ВАІРА і АПА і стымуляванне настаўнікаў шолы да атэстацыі на больш высокія кваліфікацыйныя катэгорыі.

Якасная арганізацыя адукацыйнага працэсу дазволіла прадэманстраваць дастаткова нядрэнныя вынікі падчас выступленняў навучэнцаў на другім і трэцім этапах рэспубліканскай прадметнай алімпіяды, а таксама на раённым этапе прадметных алімпіяд сярод навучэнцаў 3–9 класаў. Так, у другім этапе рэспубліканскай прадметнай алімпіяды ўдзельнічала шэсць навучэнцаў у 2012/2013 нав. годзе па геаграфіі, рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры. Па выніках алімпіяд А. Лях, навучэнка 10 класа, атрымала дыплом 3-й ступені па беларускай мове і літаратуры, Юлія Чыграй, навучэнка 11 класа, – дыплом 1-й ступені па беларускай мове і літаратуры і прадставіла Ушацкі раён на 3-м этапе рэспубліканскай прадметнай алімпіяды, дзе атрымала дыплом 3-й ступені (настаўніца Т.П. Чумакова). У 2012/2013 нав. годзе – 4 дыпломы на 2-м этапе рэспубліканскай прадметнай алімпіяды, 1 дыплом – на 3-м этапе, удзел Ю. Чыграй у заключным этапе рэспубліканскай прадметнай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

Рэпазіторый ВДУ

Педагагічны калектыў школы імкнецца да творчага пошуку. Настаўнікі актыўна ўкараняюць у адукацыйны працэс электронныя выданні вучэбнага назначэння, ствараюць умовы для развіцця даследчай дзейнасці, выкарыстоўваюць інфармацыйныя тэхналогіі, прымяняюць інтэрактыўныя метады і прыёмы праблемнага навучання; выкарыстоўваюць гульнёвыя тэхналогіі, індывідуальны падыход да навучэнцаў; развіваюць самастойную пазнавальную дзейнасць і творчыя здольнасці навучэнцаў.

Планаванне выхаваўчай работы праводзіцца зыходзячы з прыярытэтных накірункаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы выхавання. Немалаважную ролю ў пастаноўцы задач адыгралі такія знакавыя падзеі, як аб'яўленне 2014 года Годам гасціннасці, святкаванне 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, правядзенне чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску, святкаванне 90-годдзя з дня нараджэння В. Быкава. Традыцыйным стала штогадовае правядзенне Дня беларускай пісьменнасці, Дня маці і іншых мерапрыемстваў, прысвечаных памятным датам. У ідэалагічным выхаванні навучэнцаў адметную ролю адыгралі такія носьбіты дзяржаўнай палітыкі, як БРПА і БРСМ. Члены піянерскай дружыны на працягу ўсяго навучальнага года прымалі ўдзел у працоўных дэсантах, акцыях, аперацыях і інш. У раённым конкурсе піянерскіх агітбрыгад "Запалі касцёр дабрыні" наша школа стала пераможцам. Члены пярвічнай арганізацыі ГА "БРСМ" таксама дасягнулі поспехаў. Яны сталі пераможцамі ў раённых конкурсах ("Міс БРСМ", " Лідар").

Выхаваўчы працэс ва ўстанове адукацыі накіраваны на развіццё цікаўнасці школьнікаў, прывіццё здаровага ладу жыцця, арганізацыю адпачынку навучэнцаў. На базе школы працуе шмат розных гурткоў і клубаў па інтарэсах. Ваенна-патрыятычная тэматыка – адзін з галоўных напрамкаў працы школьнага музея, у якім праводзяцца не толькі экскурсіі, але і ўрокі. Настаўнікі школы вакарыстоўваюць музейныя матэрыялы ў правядзенні ўрокаў памяці, тэматычных гутарак. Экскурсаводы музея станавіліся пераможцамі раённага конкурсу экскурсаводаў "Музей у чамадане".

На працягу многіх гадоў школа застаецца цэнтрам духоўнасці і маральнасці, накоплівае вопыт, стварае сваю гісторыю. Школа заўсёды рада прыняць сваіх выпускнікоў, якія прыязджаюць з розных куточкаў Беларусі. Розныя па ўзросце, інтарэсах і характарах. І з агульным радком у біяграфіі – выпускнікі Глыбачанскай школы.









Репозиторий ВГУ